Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1 (88), 2015

*УДК 930 (476) (1921 – 1939)*

# Беларускія паланафілы і польскія ўлады ў Заходняй Беларусі міжваеннага перыяду: фінансавы аспект узаемадзеяння

А.С. Горны

Даследуецца праблема фінансавання дзейнасці беларускіх прапольскіх (паланафільскіх) арганізацый рознымі ўстановамі Польскай дзяржавы ў міжваенны перыяд. Раскрываюцца раней малавядомыя факты, якія сведчаць аб імкненнях польскіх уладаў з дапамогай грашовых субсідый забяспечыць лаяльнасць пэўнай часткі беларускіх палітычных эліт Заходняй Беларусі, каб супрацьстаяць беларускім нацыянальна-дэмакратычным і левым радыкальным групам.
**Ключавыя словы:** Польшча, Заходняя Беларусь, беларускі нацыянальны рух, беларускія паланафілы, субсідыя.

The problem of funding the Belarusian polonophilic organization by various institutions of power of the Polish state in the interwar period is described. Previously little-known facts that demonstrate the intents of the Polish authorities to ensure the loyalty of a certain part of the Belarusian political elites of Western Belarus with the help of monetary grants are revealed.
**Keywords:** Poland, Western Belarus, Belarusian national movement, Belarusian polonophils, grant.

Фінансавыя пытанні заўсёды з’яўляліся адным з важных кампанентаў дзейнасці палітычных рухаў, партый і арганізацый. Наяўнасць сталай крыніцы фінансавання нярэдка прадвызначала стабільнае развіццё той ці іншай арганізацыі і асабліва нацыянальнага руху, які пачынаў выходзіць на палітычную арэну дзеля барацьбы за нацыянальную дзяржаўнасць. Не быў выключэннем з гэтага і беларускі нацыянальны рух, які ў перыяд свайго зараджэння і ў далейшым працэсе арганізацыйнай працы патрабаваў значных грашовых інвестыцый. Аднак сёння праблема фінансавання беларускіх палітычных арганізацый у першай палове XX ст. даследавана нязначна і, на наш погляд, уяўляе адзін з найбольш актуальных кірункаў даследавання гісторыі Беларусі новага і навейшага часу.

Вывучэнне пытання грошай для беларускай палітычнай работы натыкаецца на даволі цікавы аспект, звязаны з геапалітычным становішчам беларускіх земляў. Менавіта іх геапалітычнае становішча прадвызначыла той факт, што ў працэсе развіцця беларускага руху і станаўлення нацыянальнай дзяржаўнасці імкнуліся прыняць удзел розныя знешнія актары – літоўскія, савецкія, польскія, нямецкія і іншыя, якія разлічвалі выкарыстаць «беларускае пытанне» ва ўласных геапалітычных інтарэсах. Значную ролю сярод іх меў польскі фактар. Створаная ў 1918 г. Польская дзяржава, жадаючы пашырыць свае межы на ўсход, звяртала ўвагу на прапольскія (паланафільскія) памкненні мясцовых беларускіх эліт і спрабавала падтрымаць іх грашова. Пасля заключэння Рыжскага міру, калі частка беларускіх земляў апынулася ў складзе Польшчы, яе ўлады зрабілі стаўку на шэраг беларускіх паланафільскіх арганізацый, якія павінны былі прапагандаваць сярод беларусаў ідэю лаяльнасці адносна Польшчы. Безумоўна, галоўным элементам іх падтрымкі сталі грашовыя субсідыі з польскага бюджэту. Таму мэта дадзенага артыкула – раскрыць фінансавы аспект узаемадзеяння гэтых арганізацый з польскімі ўладамі ў міжваеннае дваццацігоддзе, паказаць, як беларускія паланафілы атрымлівалі грошы ад уладаў і на якія мэты іх выдаткоўвалі.

У канцы XIX – пачатку XX стст. польскі нацыянальны рух у Расійскай імперыі, нягледзячы на пераважна адмоўнае яго стаўленне да нацыянальнай эмансіпацыі беларусаў, быў арыенцірам і узорам грамадскай барацьбы для некаторых беларускіх палітычных і культурных актывістаў. Настрой тагачасных беларускіх эліт вельмі добра ахарактарызаваў адзін з тэарэтыкаў беларускага руху А. Цвікевіч, які, аналізуючы гісторыю беларуска-польскіх узаемадачыненняў, пісаў: «Учора мы былі з ёй (Польшчай – А.Г.) разам – у адным лагеры пратэстуючых, у адным лагеры змагаючыхся супроць царызму. Польшча была для нас прыкладам, – «распятая на крыжу!» – была старшым братам у цяжкай барацьбе, надавала сілы і

pawet.net

веры» [1, с. III–IV]. Многія палітыкі былі ўпэўнены, што незалежная Польшча ў будучыні не будзе перашкодай для незалежнасці сваіх усходніх суседзяў, а, наадварот, дапаможа атрымаць самастойнасць згодна вядомаму лозунгу «за нашу і вашу свабоду».

Падобныя тэндэнцыі шырока распаўсюджваліся ўжо ў пачатку польска-савецкай вайны, але асабліва моцна – пасля заняцця польскімі легіёнамі Вільні і выдання 22 красавіка 1919 г. вядомай адозвы «Да насельніцтва былога Вялікага Княства Літоўскага». У ёй галоўнакамандуючы польскага войска Ю. Пілсудскі падкрэсліў, што мясцовым жыхарам будзе дадзена магчымасць самастойна вырашыць усе нацыянальныя і рэлігійныя пытанні без усялякага націску [2, с. 81]. Створаная польскімі ўладамі на акупаваных заходнебеларускіх тэрыторыях Цывільнае ўпраўленне ўсходніх земляў (ЦУУЗ) пачало весці перамовы аб супрацоўніцтве з некаторымі беларускімі дзеячамі, сярод якіх сваёй актыўнасцю вылучаўся П. Аляксюк [3, с. 72]. У гэты перыяд польскія інстанцыі пачынаюць не толькі на словах ствараць падмурак для лаяльнасці беларусаў, але і спансіраваць мерапрыемствы, якія, на іх думку, мелі б значную палітычную вагу. Так, у маі 1919 г. кіраўнік II аддзела польскага Генштаба (дэфензівы) у Вільні В. Славэк выдаў П. Аляксюку для правядзення беларускага з’езда Віленшчыны і Гродзеншчыны каля 10 тыс. царскіх рублёў, выказаўшы пры гэтым пажаданне, каб на дадзеным з’ездзе Ю. Пілсудскі быў абвешчаны вялікім князем ВКЛ [4, с. 106]. Аднак, беларускі з’езд Віленшчыны і Гродзеншчыны, які адбыўся 8–9 чэрвеня 1919 г., пастанавіў дамагацца незалежнасці Беларусі ў саюзе з Літвой. Разам з гэтым, дэлегаты з’езда віталі адозву Пілсудскага і выказвалі надзею, што кіраўнік Польшчы зможа змяніць рэакцыйныя паводзіны польскіх акупацыйных войскаў у Заходняй Беларусі [3, с. 73]. Створаная на з’ездзе Беларуская рада Віленшчыны і Гродзеншчыны адразу звярнулася да міністэрства фінансаў Польшчы з просьбай аб выдачы пазыкі ў суме 5 млн. польскіх марак [5, s. 831].

Кульмінацыяй прапольскіх настрояў беларускіх эліт у часы польска-савецкай вайны стала спроба стварэння беларускіх вайсковых частак у польскім войску. 2 жніўня 1919 г. па ініцыятыве Беларускай рады Віленшчыны і Гродзеншчыны была створана Беларуская вайсковая камісія (БВК) на чале з П. Аляксюком, якая павінна была кіраваць арганізацыяй беларускай арміі. Аднак афіцыйна камісія не была зацверджана польскімі ўладамі. 22 кастрычніка 1919 г. Ю. Пілсудскі падпісаў дэкрэт аб фарміраванні добраахвотніцкіх беларускіх частак у складзе двух батальёнаў, легалізаваўшы такім чынам БВК [6, с. 112–114]. Безумоўна, дадзеная структура патрабавала значнай грашовай падтрымкі, якую беларускія дзеячы чакалі ад польскага камандавання і цывільных уладаў. Прынамсі, 5 сакавіка 1920 г. Генеральная ад’ютантура Галоўнакамандуючага распарадзілася выплаціць са сродкаў міністэрства вайсковых спраў 400 тыс. марак на рахунак БВК і распрацаваць для яе месячны бюджэт [7, арк. 258]. Апошняя пастанова, магчыма, адразу не была рэалізавана альбо была спланавана ў нязначных грашовых памерах. Ужо ў канцы сакавіка сябар прэзідыуму БВК А. Прушынскі (А. Гарун) звяртаўся да Генеральнай ад’ютантуры з просьбай усталяваць месячныя выплаты ў памеры 50 тыс. марак для паўнавартаснай дзейнасці штату камісіі па вярбоўцы дабраахвотнікаў у розных гарадах [8, арк. 364]. Але, нягледзячы на распараджэнні вышэйшага польскага камандвання і фінансавую падтрымку, на месцах дзеячы БВК сутыкаліся з супрацьдзеяннем мясцовай польскай адміністрацыі, якая складалася пераважна з прыхільнікаў ідэі інкарпарацыі беларускіх земляў. Так, існаваў цыркуляр палітычнага інспектара Мінскай акругі ЦУУЗ, у якім павятовым старастам рэкамендавалася ствараць перашкоды агентам БВК у справе вярбоўкі дабраахвотнікаў [9, s. 2].

Работу камісіі значна аслаблялі асабістыя спрэчкі і непаразуменні паміж яе кіраўніцтвам. У межах БВК працавалі як прапольскія дзеячы, так і прыхільнікі эсэраўскіх арганізацый, якія знаходзіліся на антыпольскіх пазіцыях і планавалі выкарыстаць рэсурсы камісіі ў мэтах барацьбы з палякамі [2, с. 89]. Да гэтага неабходна дадаць яшчэ і няшчырасць некаторых з членаў БВК, якія нярэдка на першае месца выстаўлялі свае асабістыя інтарэсы. Таму прычынамі канфлікту маглі быць ужо не толькі ідэйныя разыходжанні, але і грашовыя спрэчкі. Польскія фінансавыя патокі, якія ва ўмовах вайны было цяжка кантраляваць, сталі значнай спакусай для некаторых беларускіх паланафілаў, і ў прыватнасці для П. Аляксюка. У чэрвені 1920 г. ён унёс у касу БВК 300 тыс. марак, атрыманых ад міністэрства вайсковых спраў Польшчы. Аднак, як выявілася пазней, насамрэч польскія ўлады асігнавалі для БВК суму ў памеры 981 500 марак [10, арк. 203]. Прадстаўнікі камісіі пачалі абвінавачваць Аляксюка ў прысвойванні 681 500 марак з польскага бюджэту. Пазней Аляксюк заяўляў, што не хацеў аддаваць гэтыя сродкі ў рукі антыпольскага элемента [5, s. 839].

Рыжскі мір, падпісаны 18 сакавіка 1921 г. паміж Польшчай і Савецкай Расіяй, стварыў новыя ўмовы для развіцця беларускага нацыянальнага руху. Заходнебеларускія землі, якія паводле мірнага пагаднення адышлі да Польшчы, сталі тэрыторыяй, дзе беларускія дзеячы розных палітычных кірункаў працягвалі весці барацьбу за ажыццяўленне ідэалаў нацыянальнай дзяржаўнасці. На заходнебеларускай палітычнай арэне заявілі пра сябе ў тым лікі і беларускія паланафільскіяі арганізацыі. З аднаго боку, яны традыцыйна спадзяваліся знайсці падтрымку розных інстытутаў польскай улады, а з другога, улада сама была зацікаўлена ў з'яўленні лаяльных беларускіх групаў, якія б транслявалі сярод насельніцтва прапольскія ідэі. Адной з першых пляцовак у гэтым накірунку стала польская квазідзяржава Сярэдняя Літва, створаная палякамі ў 1920 г. з мэтай адцягнуць тэрыторыю Віленшчыны з-пад кантролю Літвы. Літоўска-польскі канфлікт і падтрымка ў ім Літвы беларускімі нацыянальна-дэмакратычнымі арганізацыямі і ўрадам БНР прымусілі паланафілаў актыўна ўключыцца ў палітычную гульню, а польскія ўлады – аказаць ім грашовую дапамогу.

17 красавіка 1921 г. у Вільні па ініцыятыве былога кіраўніка беларускай дэлегацыі на Парыжскую мірную канферэнцыю Я. Ладнова быў утвораны Беларускі дзяржаўны камітэт (БДК), у які ўвайшлі А. Луцкевіч, А. Смоліч, А. Станкевіч, С. Рак-Міхайлоўскі, М. Гарэцкі, Б. Тарашкевіч і інш. Арганізацыя афіцыйна ставіла сабе за мэту стварыць каардынацыйны цэнтр беларускага руху дзеля барацьбы за незалежнасць Беларусі [4, с. 120–121], [11, с. 244]. Аднак насамрэч сапраўдным ініцыятарам стварэння БДК быў II аддзел польскага Генштаба, пры падтрымцы якога дзейнічаў Ладноў. Паводле разліку польскіх спецслужбаў, БДК павінен быў адцягнуць беларускія эліты ад супрацоўніцтва з Літвой, дапамагчы ім вырашыць «віленскае пытанне» на карысць Польшчы і перавесці цэнтр беларускага руху з Коўна, дзе месціўся ўрад БНР, у Вільню. Паказальна, што для ажыццяўлення гэтай акцыі Ладноў атрымліваў ад II аддзела штомесячна каля 5 тыс. французскіх франкаў [12, s. 48–49], [5, s. 852]. Акрамя гэтага, спецслужбы разлічвалі непасрэдна фінансаваць працу БДК, бо, як успамінаў Б. Тарашкевіч, шэф II аддзела ў Вільні Бандроўскі перадаў для камітэта «пэўную суму грошай», якая, аднак, была неўзабаве вернута [4, с. 122]. Праз некалькі месяцаў правакатарская дзейнасць Ладнова была выкрыта і Беларускі дзяржаўны камітэт ліквідавалі.

Паралельна з дзейнасцю БДК распачаў сваю палітычную акцыю ў Сярэдняй Літве ўжо вядомы П. Аляксюк. У красавіку 1921 г. ён ініцыяваў стварэнне паланафільскай арганізацыі «Краёвая сувязь», якая актыўна прапагандавала ідэю злучэння беларускіх земляў з Польшчай. Дзеля разгортвання значнай палітычнай работы, Аляксюк пачаў шукаць апеку з боку палякаў, абраўшы пры гэтым не спецслужбы, а мясцовыя ўлады, у прыватнасці – Прадстаўніцтва (Дэлегатуру) польскага ўрада ў Сярэдняй Літве. Аднак апошняя ўстанова вельмі асцярожна паставілася да ініцыятывы Аляксюка і першапачаткова, дзеля бліжэйшага азнаямлення з арганізацыяй, згадзілася прафінансаваць толькі выданне паланафільскай газеты «Jednaść» [13, арк. 35 адв.], [14, арк. 30 адв.]. Тым не менш, паланафілы распрацоўвалі новыя праекты, якія вымагалі значных грашовых інвестыцый. Напрыклад, Аляксюк прапанаваў уладам падтрымаць паездку дэлегацыі «Краёвай сувязі» ў колькасці 12 чалавек на беларускую нацыянальна-палітычную канферэнцыю ў Прагу і выдаткаваць на гэтую мэту каля 2 млн. марак [13, арк. 124–124 адв.]. Можна дапусціць, што ўлады значна зменшылі планаваную суму, бо ў Прагу змаглі выехаць толькі 3 прадстаўніка Краёвай сувязі.

Адносіны польскіх уладаў да акцыі Аляксюка рэзка змяніліся напярэдадні выбараў у Віленскі сойм. Выбары павінны былі адлюстраваць перад міжнароднай супольнасцю прыхільнасць мясцовага насельніцтва Віленшчыны да Польшчы і легітымізаваць у будучыні інкарпарацыю Польшчай Сярэдняй Літвы. Віленскі Беларускі нацыянальны камітэт і ўрад БНР заклікалі беларусаў байкатаваць выбарчую кампанію, таму ўвага польскіх уладаў была звернута ў бок беларускіх паланафілаў. Яны павінны былі агітаваць супраць байкоту і прыняць удзел у выбарах ад імя беларускага насельніцтва Віленшчыны. У канцы лістапада 1921 г. Палітычны камітэт Савета міністраў Польшчы рэкамендаваў мясцовым уладам падтрымаць «Краёвую сувязь», а міністэрству замежных спраў – выдаткаваць для яе са свайго бюджэту грашовыя субсідыі [15, s. 27]. У снежні 1921 г. П. Аляксюк пачаў атрымліваць на выбарчую дзейнасць грошы з фондаў кіраўніцтва Сярэдняй Літвы. Прынамсі, 15 снежня яму выдалі 1 400 000 марак, 21 снежня – 1 572 500 марак, 29 снежня – 900 000 марак, а 3 студзеня 1922 г. яшчэ 1 572 500 марак [16, арк. 130–131]. Такім чынам на рубяжы 1921–1922 гг.

беларуская паланафільская арганізацыя «Краёвая сувязь» атрымала ад польскіх уладаў агулам больш за 5 000 000 польскіх марак, што па тагачасным курсе складала каля 2 000 даляраў. Нягледзячы на гэтыя інвестыцыі, Аляксюк і яго група цалкам прайгралі выбарчую кампанію, зрабіўшы, тым не менш, для міжнароднай супольнасці «бачнасць» удзелу беларускага насельніцтва ў выбарах.

У 1924 г. у перыяд агульнай радыкалізацыі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху ў Польшчы, на палітычнай сцэне Заходняй Беларусі з'явілася новая паланафільская арганізацыя – Часовая беларуская рада (ЧБР з 1926 г. мела назву Беларуская нацыянальная рада). Яе кіраўнік А. Паўлюкевіч адразу пачаў ажыццяўляць захады па ўсталяванні кантактаў з польскімі ўладамі дзеля фінансавання прапольскай і антыбальшавіцкай акцыі. Асабліва цесна з прадстаўнікамі ЧБР супрацоўнічала віленская адміністрацыя – спачатку Дэлегатура ўрада ў Вільні, а пасля Віленскае ваяводскае ўпраўленне, і ў прыватнасці віленскі ваявода У. Рачкевіч [17, с. 38]. Грашовыя субсідыі для паланафільскай агітацыі Паўлюкевіч атрымліваў непасрэдна ў кабінеце дарадцы ваяводы Д. Пятроўскага [18, арк. 115]. Гарантыі фінансавай падтрымкі паланафілам далі таксама прадстаўнікі вышэйшага польскага кіраўніцтва. У прыватнасці, віцэ-прэм'ер Польшчы С. Тугут абяцаў ЧБР вылучыць канцэсіі на аўтобусныя перавозкі і ўтрыманне тытунёвых складаў, даходы з якіх павінны былі ісці на антыкамуністычную прапольскую агітацыю [19, арк. 249].

Цікавасць для нашага даследавання ўяўляюць дадзеныя аб фінансаванні акцыі А. Паўлюкевіча, якія ўтрымліваюцца ў адной з прац вядомага беларускага гісторыка У. Ігнатоўскага. У 1927 г. Ігнатоўскі напісаў брашуру «Каля магілы барацьбіта», дзе разглядаў абставіны замаху Б. Кавэрды на савецкага прадстаўніка ў Варшаве П. Войкава. Кавэрда меў сувязі з Часовай беларускай радай, таму ў брашуры некалькі старонак было прысвечана агляду дзейнасці гэтай арганізацыі. У якасці крыніц Ігнатоўскі карыстаўся лістамі асоб, якія «калісь былі ня толькі блізкімі да гэтай кампаніі (ЧБР – А.Г.), але нават уваходзілі ў яе склад» [20, с. 11]. З вялікай доляй верагоднасці можна меркаваць, што адной з такіх асоб мог быць былы віцэ-старшыня ЧБР Ф. Аляхновіч, які ў 1926 г. пераехаў у БССР. Нягледзячы на ідэалагізаваны характар выдання, шэраг фактаў аб дзейнасці беларускіх паланафілаў у ім пацвярджаецца іншымі крыніцамі, што дае падставы звярнуць увагу на некаторыя цікавыя дадзеныя. Так, Ігнатоўскі паведамляў, што А. Паўлюкевіч для існавання ЧБР і выканання яе планаў атрымліваў ад віленскіх ваяводскіх уладаў штомесячна спачатку 4 тыс. злотых, пасля – 3 тыс. [20, с. 19]. Акрамя гэтага, у брашуры мелася інфармацыя аб атрыманні ЧБР каля 10 тыс. злотых ад нейкага таварыства «паратунку крэсаў», пад якім, магчыма, мелася на ўвазе Таварыства стражы крэсовай. Паводле Ігнатоўскага, яшчэ адным спонсарам для Паўлюкевіча выступаў генерал С. Булак-Балаховіч, які выдаткаваў са сваіх асабістых сродкаў таксама 10 тыс. злотых [20, с. 17].

Аднак, як і ў выпадку з папярэднімі паланафільскімі арганізацыямі, кіраўніцтва ЧБР немэтазгодна распараджалася ўрадавымі субсідыямі, якія нярэдка асядалі ў кішэнях А. Паўлюкевіча і яго прыхільнікаў. У маі 1925 г. з выдадзеных уладамі грошай ён забраў сабе ў якасці пенсіі 800 злотых, 400 злотых выплаціў свайму сакратару і безгаспадарча траціў ад 300 да 400 злотых у месяц на арэнду пакояў у гатэлі, дзе месціўся сакратарыят ЧБР. «Пры такіх фундушах можна значна больш зрабіць, чым робіцца зараз, толькі патрэбна пэўная планавасць і гаспадарчасць», – падкрэслівалі некаторыя сябры арганізацыі, нязгодныя з дзеяннямі Паўлюкевіча [19, арк. 76].

Неабходна падкрэсліць, што ў 1920-х гг. паланафільская плынь беларускага руху не набыла значнай падтрымкі сярод заходнебеларускага насельніцтва і сваёй прысутнасцю толькі ўзмацняла раскольніцкія тэндэнцыі ў агульнабеларускім грамадска-палітычным жыцці. Адной з прычын яе слабасці ў гэты час з'яўлялася маргінальнасць яе лідараў, якія бачылі ва ўрадавых субсідыях крыніцу ўласнага бізнесу і заробку. Гэта прызнавалі нават самі ўлады, падкрэсліваючы, што ім было наканавана весці працу з людзьмі, якія мелі хваравітыя амбіцыі і разняволены індывідуалізм [2, с. 101]. На рубяжы 1920–1930-х гг. на змену старым паланафілам прыйшла новая генерацыя дзеячоў, якая ставіла новыя мэты ў справе супрацоўніцтва з польскімі ўладамі. У 1929 г. на абломках былой Беларускай сялянска-работніцкай грамады ўтварылася так

званая група Луцкевіча-Астроўскага (таксама мела назву «беларуская санацыя»), якая імкнулася знайсці кампрамісы з санацыйным урадам Ю. Пілсудскага. Прадстаўнікі гэтай групы (А. Луцкевіч, Р. Астроўскі, Я. Шнаркевіч, А. Трэпка і інш.) заклікалі адмовіцца ад палітычнай барацьбы за самавызначэнне Заходняй Беларусі і цалкам засяродзіцца на беларускай культурна-асветніцкай працы [21, с. 387]. Ва ўмовах аслаблення асіміляцыйнай палітыкі польскіх улад адносна беларусаў у канцы 1920-х гг. група Луцкевіча-Астроўскага чакала «новую эру» ў польска-беларускіх адносінах [22].

На адрозненне ад папярэдніх паланафільскіх арганізацый, якія выкарыстоўвалі польскія субсідыі ў палітычных і прапагандысцкіх мэтах, «беларуская санацыя» планавала накіраваць дзяржаўныя фінансы збольшага на падтрымку існуючых беларускіх культурных інстытутаў. Прадстаўнікі групы Луцкевіча-Астроўскага даволі справядліва разважалі, што беларусы як раўнапраўныя грамадзяне Польшчы маюць права атрымліваць з дзяржаўных фондаў сродкі на сваё нацыянальнае развіццё [23]. Таму для каардынацыі культурнай работы у жніўні – верасні 1930 г. «беларуская санацыя» аб’яднала ўсе арганізацыі, якія знаходзіліся пад яе кантролем (Беларускае навуковае таварыства, Беларускі настаўніцкі саюз, Бацькоўскі камітэт Віленскай беларускай гімназіі і інш), у адзіную «карпарацыю» – Цэнтральны саюз беларускіх культурна-асветніцкіх і гаспадарчых арганізацый (скарочана Цэнтрасаюз) [21, с. 389]. Р. Астроўскі як скарбнік Цэнтрасаюза ўсталяваў кантакты з Віленскім ваяводскім упраўленнем для атрымання грашовай дапамогі [11, с. 258]. Штомесячна віленскія ўлады выдаткоўвалі для Цэнтрасаюза 6 500 злотых [24, арк. 17]. У яго межах сродкі размяркоўваліся паміж арганізацыямі, якія ўваходзілі ў гэтае аб’яднанне. Напрыклад, у 1931 г. Віленскай беларускай гімназіі штомесячна выплочвалася каля 2 500 злотых, Віленскаму беларускаму музею – 1 000 злотых, студэнцкай карпарацыі «Скарынія» – 1 500 злотых [25, арк. 19].

Аднак Цэнтрасаюз на працягу 1931–1932 гг. аказаўся не ў стане кардынальным чынам паўплываць на польска-беларускія адносіны і пазіцыю ўладаў, якая ў гэты перыяд зноў вярнулася ў рэчышча нацыянальнай асіміляцыі беларусаў. Да таго ж прадстаўнікі Цэнтрасаюза ўсё больш увязваліся ў палітычную барацьбу з рознымі беларускімі групамі, у прыватнасці – з хрысціянскімі дэмакратамі і камуністамі. Таму група Луцкевіча-Астроўскага пачала шукаць новыя формы для арганізацыйнай працы. У канцы 1932 г. замест Цэнтрасаюза было ўтворана Таварыства беларускай асветы (ТБА), якое ставіла сабе за мэту выключна культурную работу [21, с. 390]. Як і яго папярэднік, ТБА мела фінансавую падтрымку з боку віленскіх ваяводскіх уладаў, якія штомесячна выдаткоўвалі для яго каля 3 000 злотых [25, арк. 41]. Акрамя гэтага, у маі 1935 г. кіраўніцтва таварыства звярнулася да начальніка грамадска-палітычнага аддзел Віленскага ваяводскага ўпраўлення аб выдзяленні яшчэ 1 000 злотых штомесячна для забеспячэння выдання друкаванага органа ТБА «Родны край» [26, арк. 8]. Паказальна, што ўсе фінансавыя справы арганізацыі зноў знаходзіліся пад кантролем Р. Астроўскага [25, арк. 41]. У будучыні гэтая акалічнасць стала адной з прычын расколу ўнутры «беларускай санацыі». Асабістыя і ідэйныя непаразуменні паміж А. Луцкевічам і Р. Астроўскім неўзабаве перайшлі ў фінансавую плоскасць, бо апошняга пачалі абвінавачваць у прысвойванні ўрадавых субсідый і хаатычным распараджэнні грашыма [24, арк. 211]. Спрэчкі і канфлікты негатыўна уплывалі на работу ТБА і яго «імідж» сярод польскіх уладаў. З-за арганізацыйнай слабасці і фактычнай недзеяздольнасці, у пачатку 1936 г. ваяводскае ўпраўленне адмовілася фінансаваць таварыства [27, арк. 9]. Пасля гэтага праўрадавы кірунак у беларускім нацыянальным руху фактычна перастаў існаваць.

Нягледзячы на выдаткаванне вялікіх на той час грашовых сродкаў, польскім уладам так і не ўдалося атрымаць значныя палітычныя дывідэнды і стварыць шырокі паланафільскі рух сярод беларускіх эліт Заходняй Беларусі. Разам з гэтым, паланафільскія арганізацыі, падтрыманыя польскімі ўладамі, на палітычнай арэне выступалі практычна супраць усіх беларускіх групаў рознай скіраванасці, што значна перашкаджала кансалідацыі беларускага нацыянальнага руху. Спробы «беларускай санацыі» ў 1930-х гг. перавесці фінансавыя патокі ў рэчышча культуры прынеслі пэўны поспех для шэрагу беларускіх культурных інстытутаў, якi, аднак, адразу ж перакрэсліваўся палітыкай ураду па абмежаванні беларускага школьніцтва і культурнага жыцця. Плоцячы за лаяльнасць беларусаў, польскія ўлады ў міжваенны перыяд не ўлічвалі таго, што яна павінна была б падмацоўвацца не толькі грашовымі адзінкамі, а рэальнымі зменамі ў ва ўсіх сферах жыцця беларускага народа.

## Літаратура

1. Цьвікевіч, А. Адраджэньне Беларусі і Польшча / А. Цьвікевіч. – Менск–Вільня–Берлін : Выдавецкае таварыства «Вызваленьне», 1921. – VII. – 191 с.

2. Кароткі нарыс беларускага пытаньня. – Мінск : Логвінаў, 2009. – 396 с.

3. Гамулка, К. Паміж Польшчай і Расіяй. Беларусь у канцэпцыях польскіх палітычных фарміраванняў (1918–1922) / К. Гамулка – Вільня : Выдавецтва ЕГУ, 2008. – 255 с.

4. Тарашкевіч, Б. Аўтабіяграфія / Б. Тарашкевіч // Спадчына. – 1996. – № 4. – С. 96–132.

5. Czarniakiewicz, A. «Inwestycja w lojalność»: Próby finansowania przez polskie instytucje rządowe białoruskiego ruchu narodowego / A. Czarniakiewicz // Przegląd Wschodni. – 2013. – Tom XII. – Zeszyt 4. – S. 825–862.

6. Латышонак, А. Жаўнеры БНР / А. Латышонак. – Беласток-Вільня : Беларускае гістарычнае таварыства, Інстытут беларусістыкі, 2009. – 366 с.

7. Instytut Józefa Piłsudskiego w Ameryce (IJP). – Zespół : Adiutantura Generalna Naczelnego Wódza. – Teczka 701/2/7.

8. IJP. – Zespół : Adiutantura Generalna Naczelnego Wódza. – Teczka 701/2/24.

9. Krótki zarys historyczny białoruskiego polonofilstwa // Kurjer Wileński. – 1925. – № 183. – S. 2.

10. IJP. – Zespół : Adiutantura Generalna Naczelnego Wódza. – Teczka 701/2/26.

11. Луцкевіч, А. Да гісторыі беларускага руху / А. Луцкевіч. – Вільня-Беласток : Беларусакае гістарычнае таварыства, Інстытут беларусістыкі, 2010. – 346 с.

12. Czarniakiewicz, A., Paszkiewicz, A. Kwestia białoruska w planach Oddziału II Sztabu Generalnego Wojska Polskiego w latach 1919–1923 / A. Paszkiewicz, A. Czarniakiewicz // Przegląd historyczno-wojskowy. – 2011. – № 3. – S. 43–56.

13. Lietuvos centrinis valstybės archyvas (LCVA). – F. 22. – Ap. 1. – B. 42. Доклад о деятельности белорусских буржуазно-националистических организаций и их руководителей в Польше, Литве и странах Западной Европы с приложениями, характеризующими деятельность данных организаций.

14. LCVA. – F. 22. – Ap. 1. – B. 54. Сведения о буржуазно-националистических белорусских партиях и организациях Польши и Литвы.

15. O niepodległą i granice / wstęp, wybór, opracowanie i przygotowanie do druku: Marek Jabłonowski, Włodzimierz Janowski. – Warszawa-Pultusk, 2004. – T. 5 : Protokoły Komitetu Politycznego Rady Ministrów, 1921–1926. – 535 c.

16. LCVA. – F. 22. – Ap. 1. – B. 55. Raport w sprawach białoruskich na terenie Litwy Środkowej.

17. Аляхновіч, Ф. У капцюрох ГПУ / Ф. Аляхновіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1994. – 283 с.

18. LCVA. – F. 131. – Ap. 3. – B. 468. Akta prokuratora Sądu Okręgowego w Wilnie w sprawie A. Pawlukiewicza i A. Budzilowicza.

19. LCVA. – F. 15. – Ap. 2. – B. 232. Sprawozdania sytuacyjne z życia społecznego i politycznego m. Wilno 1925 r.

20. Ігнатоўскі, У. Каля магілы барацьбіта / У. Ігнатоўскі. – Менск : Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, 1927. – 29 с.

21. Рижский мир в судьбе белорусского народа 1921–1953 гг : в 2 кн. / А.А. Коваленя [и др.]. // Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. – Минск : Беларуская навука, 2014. – Кн. 1. – 593 с.

22. Копны. Як-жа запраўды будзе выглядаць «Новая Эра» / Копны // Наперад. – 1930. – № 22. – С. 1.

23. Эра. Яшчэ адна – можа апошняя – спроба / Эра // Наперад. – 1930. – № 21. – С. 1.

24. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛіМ). – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 270. Дакументы грамадскага суда Р. Астроўскага супраць А. Луцкевіча, У. Самойла, А. Трэпка.

25. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 242п. – Воп. 1. – Спр. 435. Агляд стану і дзейнасці беларускіх нацыянальна-фашысцкіх груповак у Заходняй Беларусі і іншыя матэрыялы па нацыянальнаму пытанню.

26. LCVA. – F. 51. – Ap. 7. – B. 763. Sprawa dotyczące redagowania czasopisma «Rodny kraj».

27. LCVA. – F. 53. – Ap. 23. – B. 2005. Akta w sprawie rejestracji i likwidacji związków i stowarzyszeń (statuty, sprawozdania, protokoły, korespondencja). Towarzystwo Oświaty Białoruskiej.

Гродненский государственный
университет им. Я. Купалы

Поступила в редакцию 12.12.2014

pawet.net